# “Зорка” на шляху дабра...

20.02.2020 12:09, Гродзеншчына

**З пачатку навучальнага года акцябрацкі атрад“ Зорка” 4 класа піянерскай дружыны імя А. Клімко Мінойтаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна ўдзельнічае ў вялікай цімураўскай гульні “ДобраДел” Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі.**



Першы маршрут — “На шляху ў краіну дабра”. Дзеці далі назву сваёй камандзе, прыдумалі дэвіз. Акцябраты прачыталі кнігу Аркадзя Гайдара “Цімур і яго каманда”, даведаліся, адкуль узяў пачатак цімураўскірух. Заданні першага маршруту зацікавілі акцябрат, і яны з энтузіязмам узяліся за справу.

Цімураўцы разам са старэйшымі піянерамі аформілі штаб добрых спраў, дзе на працягу ўсёй гульні размяшчалі патрэбную інфармацыю пра добрыя справы каманды.

Акцябраты правялі разведку карысных спраў і вызначылі аб’екты цімураўскага клопату. Аперацыя “Цімураўцы” пачалася з віншавання настаўнікаў-ветэранаў. Акцыя “Чысты лес” дапамагла дзецям убачыць экалагічныя праблемы. Клопат пра птушак суправаджаўся дэвізам “Будзем птушкам дапамагаць нашу зіму зімаваць”. Не засталася ўбаку ад цімураўскага клопату і школьная бібліятэка. Аперацыя “Кніжкіна бальніца” дапамагла вярнуць кнігам новае жыццё.

Маршрут “Спяшайцеся рабіць дабро” праклалі напярэдадні Новага года і Каляд. Цімураўцы арганізавалі збор навагодніх і калядных падарункаў, каб перадаць у дзіцячыя сацыяльныя ўстановы, падарыць адзінока пражываючым жыхарам вёскі. Карта добрых спраў пастаянна папаўнялася новымі маршрутамі.

Цяпер дзеці праходзяць маршрут “75 кадраў пра дабро”. Наперадзе ў цімураўцаўя шчэ шмат цікавага і незвычайнага, але навучэнцы ўпэўнены, што няма большага шчасця, чым рабіць дабро і дарыць людзям хвіліны радасці.

**Алена ВІШНЕЎСКАЯ,**
**педагог-арганізатар Мінойтаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна**

https://ng-press.by/grodzenshchyna/zorka-na-shlyahu-dabra